

ПРЫМАЕМ СПАДЧЫНУ ПРАВІЛЬНА 4

ГІСТОРЫЯ Ў ЛІЧБАВЫМ ФАРМАЦЕ 12–13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ЛІПЕНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 134 (29248)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валянцін ШАТРАЎКА, першы намеснік міністра лясной гаспадаркі:**

*«Асноўная прычына ўзнікнення ўзгаранняў у лясным фондзе — невыкананне грамадзянамі патрабаванняў пажарнай бяспекі. Абмежаванні і забароны на наведванне лясоў уводзяцца згодна з рашэннямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў на падставе атрыманых даных Белгідрамета пра клас пажарнай небяспекі (узгаральнасці). Клас пажарнай небяспекі штодня мяняецца, і абмежавальныя меры аператыўна ўносяцца на карту забаронаў і наведванняў на сайце Мінлясгаса».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Без дарог Беларусі няма. Гэта і настрой людзей, і эканоміка, і транзіт, на якім можна зарабіць»



Фота БелТА.

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка афіцыйна адкрыў рух па новым мосце, які злучыў правы і левы берагі Сожа. На гэты мост мясцовыя жыхары і ўлады ўскладаюць вялікія надзеі па развіцці паўднёвага ўсходу Магілёўшчыны і слаўгарадскага Засожжа ў прыватнасці: 15 працэнтаў тэрыторыі аддзеленыя ад астатняга раёна ракой, праз якую ніколі не было зручнай пераправы (у цёплую пару года восем вёсак з райцэнтрам злучаў пантонны мост, а ў халодную трэба было рабіць круг у сто кіламетраў). Мост дазволіць звязаць паміж сабой раёны паўднёвага ўсходу Магілёўскай вобласці ўстойлівай сувяззю з самымі сучаснымі нагрузкамі. Акрамя таго, мост забяспечвае лепшы доступ да мясцовай славутасці — Блакітнай крыніцы, якую наведваюць дзясяткі тысяч людзей не толькі з Беларусі, але і з іншых краін.**

СТАР. 2

# АЛЕКСАНДРЫЯ САБРАЛА СЯБРОЎ

На мінулыя выхадныя на беразе Дняпра, у аграгарадку Александрыя было шматлюдна. І гэта ўжо традыцыя — купальскі фестываль у Шклоўскім раёне ўжо каторы год збірае гасцей з усіх куточкаў Беларусі, з блізкага і далёкага замежжа. Нашы карэспандэнты таксама там былі, і аб тым, што пачулі і ўбачылі, гатовы падзяліцца са сваімі чытачамі. Глядзіце 2-ю і 8-9-ю старонкі — працяг купальскай гісторыі там.




Фота БелТА.

КОРАТКА

• Савет Рэспублікі праўдзе да канца ліпеня серыю прамых тэлефонных ліній.

**• У Беларусі больш за 8 % ВУП ідзе на падтрымку сем'яў з дзецьмі.**

• Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка сёння ў Маскве сустрэнецца са старшынёй урада Расіі Міхаілам Мішусціным.

**• Беларусь заняла 40-е месца ў рэйтынгу ААН па гатоўнасці да электроннага ўрада.**

• Шматфункцыянальныя «разумныя вокны» распрацавалі навукоўцы БДУ.

**• Белтэлерадыёкампанія пакажа асноўныя мерапрыемствы «Славянскага базару ў Віцебску».**

• «Белмытнясэрвіс» увайшоў у топ-3 беларускіх транспартна-лагістычных кампаній.

**• Летняя школа юных эканамістаў адкрываецца 16 ліпеня ў БДУ.**

• «Белавія» 15 ліпеня выканае чартарны рэйс Ташкент — Мінск.

Праблемы і рашэнні

# ЭКАНОМІКА І НАСТУПСТВЫ ПАНДЭМІІ

## Як выйсці на ранейшы ўзровень

**Пандэмія каранавіруса не найлепшым чынам паўплывала на дзейнасць шмат якіх галін народнагаспадарчага комплексу Міншчыны. Як прадпрыемствы і арганізацыі выходзяць са складанай сітуацыі, чым ім дапамагае дзяржава, расказаў «Звяздзе» старшыня камітэта эканомікі Мінаблвыканкама Дзяніс КУРЛЕНКА.**

***— Дзяніс Мікалаевіч, на якую падтрымку могуць разлічваць суб'екты гаспадарання Мінскай вобласці, найбольш пацярпелыя ад пандэміі, — у тым ліку і недзяржаўнай формы ўласнасці?***

— Адпаведна Указу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 красавіка 2020 года № 143 «Аб падтрымцы эканомікі» на дапамогу могуць разлічваць суб'екты ўсіх формаў уласнасці, віды дзейнасці якіх найбольш зазналі неспрыяльнае ўздзеянне эпідэміялагічнай сітуацыі. У межах дакумента вызначаны льготы і прэферэнцыі ў частцы падаткаабкладання і арэндных адносін.

***— Прадпрыемствы і арганізацыі якіх сфер дзейнасці найбольш адчулі на сабе наступствы пандэміі?***

— У большай ступені — грамадскага харчавання, турызму. У транспартнай галіне істотна зніжаны пасажыраабарот у рэгулярных напрамках, адзначаецца адмоўная дынаміка грузаабароту і экспарту транспартных паслуг.

Складаная сітуацыя з напаўненнем санаторна-курортных арганізацый і гасцініц. Загрузка сродкаў размяшчэння ў сярэднім складае 33 %. Разам з тым у красавіку гэтага года паказчык не перавышаў 13 %.

Аднак цяпер суб'ектамі гаспадарання прымаюцца рашэнні аб аднаўленні работы аб'ектаў грамадскага харчавання. Асобныя турыстычныя прадпрыемствы пачынаюць фарміраваць прапановы на летні адпачынак.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

# «Без дарог Беларусі няма. Гэта і настрой людзей, і эканоміка, і транзіт, на якім можна зарабіць»

## Запатрабаваныя калідоры

Развіццю паўднёва-ўсходніх рэгіёнаў Магілёўскай вобласці Аляксандр Лукашэнка надае вялікую ўвагу. Менш за год таму ён наведваў Касцюковіцкі раён, каб на свае вочы пабачыць, як рэалізуецца Указ № 235 ад 8 чэрвеня 2015 года і адпаведная праграма, згодна з якімі шэраг прэферэнцый і льгот атрымалі прадпрымальнікі і жыхары Крычаўскага, Клімавіцкага, Краснапольскага, Касцюковіцкага, Слаўгарадскага, Чэрыкаўскага і Хоцімскага раёнаў. Тады Прэзідэнт правёў нараду, на якой дэталёва разгледзеў стан спраў у рэгіёне і запатрабаваў ад мясцовых уладаў забяспечыць штогадовую дынаміку эканамічнага росту, каб людзі, якія тут жывуць і працуюць, адчувалі сябе ўпэўнена, жылі годна і ганарыліся сваёй малой радзімай.

У канцы мая сёлета дзеянне 235-га ўказа было працягнута да 2025 года.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Заяц далажыў кіраўніку дзяржавы аб развіцці рэгіёна. Аб'ём валавога рэгіянальнага прадукту за пяць месяцаў года склаў 98,3 працэнта да леташняга ўзроўню пры зададзенні на паўгоддзе 102,5 працэнта. На Магілёўшчыне са студзеня да сакавіка былі працаўладкаваныя 1133 чалавекі на наваствораныя рабочыя месцы на новых вытворчасцях і прадпрыемствах. Сярэдні заробак цяпер складае 954 рублі.



Фота БелТА.

Міністр транспарту і камунікацый Аляксей Аўраменка таксама далажыў аб рэалізацыі праграмы рэканструкцыі і мадэрнізацыі маставых збудаванняў за кошт крэдытаў Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця. У выніку праекта цягам трох гадоў будуць абноўленыя два пуцеправоды праз чыгунку на трасе М-10, пуцепровод праз аўтамабільную дарогу на трасе М-8, 14 мастоў праз рэкі і адзін праз Дняпроўска-Бугскі канал.

ЕБРР выдзяляе на рэканструкцыю і мадэрнізацыю 18 мастоў 126 мільёнаў еўра. Прэзідэнт пацікавіўся перспектывай развіцця дарожнай сеткі ў паўднёвым і паўночным напрамках, станам мясцовых дарог.

У нас ужо з Мінскам звязаныя ўсе абласныя цэнтры цудоўнымі дарогамі, цяпер трэба прывесці ў парадак дарогі, якія злучаюць абласныя цэнтры з раённымі, наступны этап — годныя дарогі павінны быць ад райцэнтраў да аграгарадкоў. Пасля гэтага настане час аднавіць дарогі і да малых вёсак.

***«Без дарог Беларусі няма,*** — заявіў лідар. — ***Гэта і настрой людзей, і эканоміка, і транзіт, на якім можна зарабіць».***

## Меліярацыя і лагістыка

Меліярацыя — другое найважнейшае пытанне развіцця рэгіёна. Неабходна вярнуць да жыцця землі, у якія былі ўкладзены вялізныя грошы яшчэ ў савецкія часы, лічыць Прэзідэнт.

«Далей цягнуць нельга. Я ўжо бачу з верталёта, — сказаў ён дзяржаўным служачым, якія яго сустрэлі на Слаўгарадчыне. — ...Меліярацыйная работа ў нас прыпынілася. А палі ніядрэнныя».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што шмат палёў зарастае хмызняком. Размова не толькі пра Слаўгарадскі раён.

***«Пакуль хмызняк, а заўтра ўжо будуць такія пні, якія прыйдзецца карчаваць,*** — папярэдзіў ён. — ***Таму трэба кінуць усё, палічыць, бо закапаць у балота можна любыя грошы...*** Таму асабіста палічыць і пад адказнасць губернатараў».

Пасля размовы з кіраўніцтвам вобласці і міністрам транспарту і камунікацый Прэзідэнт падышоў да людзей, якія, нягледзячы на халодны дождж, чакалі яго на новым мосце: маставы будаўнікі, дарожнікі і мясцовыя жыхары.

«Мы дамовіліся з еўрапейцамі пра тое, што ў найбліжэйшыя тры гады вось такіх мастоў і больш складаных пабудуем і мадэрнізуем 18, — паведаміў Прэзідэнт. — Гэта ж транзіт з усходу на захад, яны (ЕС. — **«Зв.»**) у гэтым зацікаўлены. ***...Добра, што мы своечасова падхапілі свае дарогі, прывялі ў парадак, сёння яны (транзітныя грузы. — «Зв.») перамяшчаюцца праз Беларусь, а гэта добрыя для нас грошы».***

Аляксандр Лукашэнка выказаў пажаданне, каб конкурс на будаўніцтва гэтых мастоў выйгралі беларускія арганізацыі, каб грошы, выдаткаваныя на масты, засталіся на гэтай зямлі.

Раней падобныя конкурсы беларусам удавалася выйграваць, дзякуючы, па словах Прэзідэнта, у тым ліку і дзяржаўнаму кіраванню.

***«Гэта дазваляла нам выйграваць гэтыя тэндары, бо ніхто нікому не даваў адкаты, ніхто не завышаў кашторыс, усё было сумленна»,*** — аргументаваў ён.

## Прыцягненне зямлі

Яшчэ адно важнае распараджэнне кіраўніка дзяржавы — будаваць дарогі з бетону, што дазволіла не толькі выкарыстаць лішкі беларускага цэменту, але і сэканоміць на вырабе асфальту.

Да таго ж беларусы навучыліся будаваць вельмі якасныя дарогі з бетону. І менавіта такія павінны быць ад раённых цэнтраў да ўсіх аграгарадкоў — так званыя ўнутрыгаспадарчыя.

«Дарогі — гэта жыццё. Няма дарогі, няма жыцця», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Працягваючы абмалёўваць людзям планы на найбліжэйшую будучыню, Аляксандр Лукашэнка закрануў і тэму пустых зямель у былых цэнтральных гаспадарках, якія страцілі свой статус, а таксама ў так званых неперспектыўных вёсках.

«Вёскі кідаць нельга, — упэўнены беларускі лідар. — ***Вёскі трэба выратоўваць. А як?.. Трэба аддаць гэтыя кавалкі зямлі людзям пад дачы».***

У гэтым залог здароўя нацыі і стабільнасці ў грамадстве, дадаў ён. Менавіта на гэта будзе накіраваная вялікая сацыяльная праграма. І, дарэчы, каб яна была рэалізаваная, таксама патрэбны дарогі.

Мясцовыя жыхары шчыра падзякавалі кіраўніку дзяржавы за ўвагу і клопат пра раёны, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС: «Гэты мост — знак таго, што мы патрэбныя тут, дома, на роднай зямлі, дзе ствараюцца ўсе неабходныя ўмовы для нармальнага жыцця».

Прэзідэнт пагадзіўся, што чалавек больш за ўсё патрэбны на сваёй зямлі, якую ведае і любіць.

«Мы прынялі Праграму развіцця паўднёвага ўсходу Магілёўскай вобласці... У будучай пяцігодцы праграма павінна быць рэалізаваная. Калі мы рэалізуем яе, Магілёўшчына будзе жыць. Гэта будзе цудоўнае дапаўненне да яе караваю, — дадаў ён. — Глядзіце на сваю зямлю, бо калі замацуецеся тут, то і дзеці вашы будуць жыць. Яны атрымаюць фундамент для развіцця. А калі будзеце «гастраляваць» па Беларусі альбо па свеце, то калі вернецеся — тут нічога не будзе, і дзе будуць вашы дзеці? Таму будуйце свой дом тут».

Прэзідэнт паабяцаў, што зробіць усё, каб праграма развіцця паўднёвага ўсходу Магілёўскай вобласці была рэалізаваная.

Падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця маставога перахода праз раку Сож аўтатрасы Р-140 Слаўгарад — Краснаполле сімвалічны ключ кіраўніку дзяржавы перадаў генеральны дырэктар РУП «Магілёўаўтадар» Анатоль Лапацін.

Прэзідэнт, у сваю чаргу, перадаў потым сімвалічны ключ Леаніду Зайцу і заўважыў, што людзі задаволеныя новым кіраўніком рэгіёна.

Праехаўшы па новым мосце, Аляксандр Лукашэнка накіраваўся да мясцовай славутасці — Блакітнай крыніцы, дзе пакаштаваў слаўгарадскія дамашнія сыры, мёд, пагутарыў з рамеснікамі і пчалярамі. На самой крыніцы зайшоў у капліцу, паразмаўляў са святарам і паломнікамі.

Па словах старшыні райвыканкама Сяргея Міхалюты, у выхадныя дні сюды прыязджае да трох тысяч чалавек. Мясцовыя ўлады клапоцяцца пра тое, каб захаваць гэта ўнікальнае месца.

Дарэчы, некаторыя журналісты і члены дэлегацыі, якія суправаджалі Прэзідэнта, таксама з задавальненнем прайшліся па рэчышчы гэтага празрыстага цуду з крыштальнай ледзяной вадой басанож. Па асабістым уражанні скажу — сапраўднае захапленне!

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
*Слаўгарадскі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З першых вуснаў

# «Маё сэрца канчаткова і беспаваротна аддадзена гэтай зямлі і гэтым людзям»

## Больш за 100 тысяч гасцей і ўдзельнікаў прыехалі ў аграгарадок Александрыя на свята «Купалле»

**«Александрыя збірае сяброў» — свята заўсёды чаканае, а сёлета яно было проста неабходнае беларусам. Руплівая праца, каб вытрываць у надзвычай складанай эканамічнай сітуацыі, няпростая санітарна-эпідэміялагічная абстаноўка — у такіх умовах жыла краіна апошнім часам, таму купальская чароўная атмасфера прыцягнула ў аграгарадок на Дняпры шмат гасцей. Дарэчы, магчымасць адпачыць на прыродзе, палюбавацца краявідамі дало і надвор'е. У суботу, быццам па заказе, нябесная канцылярыя прыпыніла дзённыя дажджы, і пахмурнае неба расквеціла сонейка.**

Галоўнай падзеяй форуму стаў гала-канцэрт «Мая Александрыя». На ім прысутнічаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што шчаслівы вітаць усіх на гасціннай александрыйскай зямлі. Па яго словах, гэтае свята — нагода паглядзець адно аднаму ў вочы, пагаварыць са старымі таварышамі, набыць новых сяброў, «удыхнуць на поўныя грудзі летняе, напоўненае водарам мёду і наспяваючых каласоў паветра беларускіх палёў, пачуць спевы птушак, убачыць зорнае неба без гарадскіх агнёў».

«Мы маем магчымасць зноў пагрузіцца ў тое, што было самым звычайным у нашым басаногім дзяцінстве, але стала для многіх у сучасным свеце сапраўднай раскошай. Такую выдатную магчымасць вось ужо больш за дзесяць гадоў дае нам гэты народны фестываль з дзівосна цёплай, добрай і светлай атмасферай, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Сотні тысяч гледачоў, гаспадары рамесных і фермерскіх падворкаў, беларускія і замежныя артысты, якія імкнуцца прыехаць да нас (і гэты складаны год не выключэнне), не проста сталі сябрамі, а амальараднімі».

На думку кіраўніка краіны, такіх свят, якія б аб'ядноўвалі асноўныя славянскія народы, няшмат. А «Купалле» ў Александрыі яшчэ можна назваць і рэпетыцыяй галоўнай сумеснай падзеі — «Славянскага базару ў Віцебску».

Нездарма кажуць, што рай для кожнага чалавека там, дзе знаходзіцца яго сэрца. «Не толькі маё, але і ўсіх, хто сабраўся, сэрцы тут. ***Маё сэрца канчаткова і беспаваротна аддадзена гэтай зямлі і гэтым людзям. Усім беларусам, нашаму мудраму і моцнаму народу. Народу, які за многія стагоддзі сваёй гісторыі перажыў нямала бед і няшчасцяў, але ніколі і ні перад кім не станавіўся на калені. Народу, які выдатна ведае кошт слоў і спраў, які выпакутаваў права жыць у сваёй дзяржаве і самастойна выбіраць і вызначаць сваю будучыню»,*** — дадаў Прэзідэнт.

2020-ы завяршае трылогію Годоў малой радзімы. Кіраўнік краіны папрасіў прысутных азірнуцца вакол, паглядзець, колькі добрага зроблена намі для роднай зямлі.

«Ваша вялікая заслуга ў тым, што ўжо не адно пакаленне беларусаў расце ў шчаслівай, чыстай, мірнай і прыгожай краіне. Краіне, якую стварылі мы з вамі практычна з нуля на абломках вялікай імперыі, імя якой Савецкі Саюз. Так, было нялёгка. Відома, ***нешта атрымалася на «выдатна», нават лепш, чым мы сабе калісьці ўяўлялі. Штосьці на «добра». А над нечым трэба будзе яшчэ нямала працаваць. Бо мы ж з вамі дакладна ведаем: каравай свежага духмянага натуральнага хлеба — гэта вынік доўгай, упартай і карпатлівай працы.*** І ніяк інакш», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, адзіны спосаб стварыць найлепшую будучыню для сваёй краіны і для свайго народа — працаваць на вынік, аб'ядноўвацца перад любымі выпрабаваннямі, пераадольваць усе цяжкасці. «Нездарма ў савецкія часы гаварылі: перш чым спытаць, што Радзіма зрабіла для цябе, спытай: а што я зрабіў для Радзімы, для сваёй краіны, для свайго народа? І адкажы на гэтае пытанне сумленна, — нагадаў Прэзідэнт. — ***Сапраўдная любоў да Айчыны — стваральная. Таму давайце і далей разам будаваць нашу Беларусь справядлівай, бяспечнай і моцнай краінай.*** Зараз гэта вельмі актуальна — калі моцныя гэтага свету імкнуцца перадзяліць свет, зламаць устоі, навязаць больш слабым краінам сваё мысленне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка і выказаў думку, што ў такія часы галоўнае — слухаць сваё сэрца, якое заўсёды пакажа самы дакладны і правільны шлях у будучыню.

* * *

Беларусы любяць і ўмеюць сустракаць гасцей — гэта яшчэ раз падкрэсліла Александрыя. «Александрыйскі кірмаш», выстаўка Мінскага трактарнага завода «Зроблена ў Беларусі» паказалі, наколькі працавітыя, таленавітыя і вынаходлівыя нашы людзі, «Спажывецкая» і «Гандлёвая» вуліцы — як гасцінна мы прымаем сяброў і як смачна іх частуем.

Падчас свята адбыліся гранд-фінал і цырымонія ўзнагароджання ўдзельнікаў рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла». З гэтага года яго фінал прымеркаваны да форуму ў Александрыі. Пераможцамі стала сям'я Зубко з Пастаўшчыны.

Самая цікавая частка свята — гала-канцэрт «Мая Александрыя» і феерверк. Сцэнарый уяўляў сабой гісторыю ў песнях пра чалавека, які выбраў сваю жыццёвую дарогу, пацвердзіўшы, што сам гаспадар свайго лёсу. Падчас канцэрта ўсё ж такі пайшоў гарэзлівы дождж, але арганізатары як руплівыя гаспадары і тут паклапаціліся пра гасцей. На кожнае месца амфітэатра загадзя паклалі дажджавікі.

Свята, якое, дарэчы, упершыню праходзіла пад патранатам ЮНЕСКА, працягнулася і ў нядзелю.

**Марыя ДАДАЛКА.**

*Фотарэпартаж са свята нашага фотакарэспандэнта Тацціяны ТКАЧОВАЙ — на 8-й — 9-й стар.*

Абітурыент-2020

# ЯШЧЭ АДНА МАГЧЫМАСЦЬ

**Пачалася рэгістрацыя на ЦТ у рэзервовыя дні. Яна працягнецца да 17 ліпеня.**

У гэтым годзе колькасць пунктаў правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні павялічылася. Калі раней гэта былі толькі Беларускі дзяржаўны універсітэт, то сёлета ЦТ у рэзервовыя дні будзе праходзіць таксама на базе ВНУ — каардынатараў ЦТ у кожным абласным цэнтры: гэта Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы.

Да здачы ў рэзервовыя дні дапускаюцца толькі тыя абітурыенты, якія зарэгістраваліся на асноўнае ЦТ, але з уважлівай прычыны не змаглі на ім прысутнічаць. У пералік уважлівых прычын нароўні з хваробай сёлета патрапіла і знаходжанне абітурыента на самаізаляцыі. Камісія будзе разглядаць кожны канкрэтны выпадак і прымаць рашэнне. Абітурыенты, якія былі адхілены ад удзелу ў ЦТ за парушэнні, у рэзервовыя дні здаць экзамен не змогуць.

Рэзервовымі днямі для здачы ЦТ па беларускай і рускай мовах зацверджаны 19 і 21 ліпеня. Для грамадазнаўства, матэматыкі, біялогіі, замежных моў (англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай, кітайскай), хіміі, фізікі, гісторыі Беларусі, геаграфіі, сусветнай гісторыі найноўшага часу рэзервовымі днямі будуць 19 і 23 ліпеня.

Сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання ў пунктах яго правядзення абітурыентам пачнуць выдаваць з 24 ліпеня, а тым, хто здаваў ЦТ у рэзервовыя дні, — з 29 ліпеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Культасвета

# КАЗКА ДЫ НАМЁК

**Новую оперу для дзяцей «Пінокія» прадставіць гледачам у канцы 2020-га Вялікі тэатр Беларусі. Канцэпцыю пастаноўкі паводле казачнай гісторыі Карла Калодзі абмяркоўвалі днямі на мастацкай радзе.**

Упершыню опера нямецкага кампазітара Глорыі Бруні «Пінокія» была пастаўлена не так даўно — прэм'ера адбылася ў 2008-м у Гамбургу, далей эстафету падхапілі тэатры Неапаля, Пармы, Лондана. У Беларусі ж за ўвасабленне знакамітай казкі ўзяліся рэжысёр Наталля Бараноўская (для яе гэта будзе рэжысёрскі дэбют на вялікай сцэне), мастачка Любоў Сідзельнікава і дырыжор Уладзімір Авадок — дарэчы, з яго падачы аўтар оперы, якая ўхваліла беларускую рэдакцыю спектакля, нават дапісала некалькі нумароў.



Як мяркуе рэжысёр, аповед пра ператварэнне драўлянай лялькі ў чалавека будзе цікавы і актуальны для маленькіх гледачоў, бо ў вобразнай, гульнявой форме закранае сур'ёзныя пытанні дабра і зла, вучыць прызнаваць свае памылкі і выпраўляць іх. Пінокія і Бураціна, якіх многія блытаюць, зусім не тоесныя героі, падкрэслівае Наталля Бараноўская: у адрозненне ад свайго маладзейшага сабрата з казкі Аляксея Талстога «Залаты ключык, ці Прыгоды Бураціна» (1936 год), Пінокія ахвяруе жыццём дзеля іншага, таму і становіцца чалавекам. Розніцу сюжэтаў узмацняць і іншыя дзеючыя персанажы, сярод якіх гледачы не ўбачаць звыклых Мальвіны, Артэмона і П'еро, затое сустрэнуць Пясочнага чалавека, і сцэнічнае афармленне — мультыплікацыя, пясочныя карціны і нават адсылкі да творчасці Леанарда да Вінчы.

Прэм'ера дзіцячай оперы на сцэне Вялікага тэатра Беларусі запланавана на снежань, як мяркуецца ў дні школьных канікул. Але ўжо зараз у тэатры шукаюць будучых выканаўцаў галоўных партый — Пінокія, Феі, Лісы, Ката, Джэпета і Цвыркуна. Анкеты і фотаздымкі ад ахвотных прайсці жывое праслухоўванне прымаюцца да 27 жніўня праз электронную пошту competition@bolshoibelarus.by, а сам кастынг пройдзе 5 верасня.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота pinocchioopera.org.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Анджэй Дуда перамог на выбарах прэзідэнта Польшчы



Дзеючы прэзідэнт Польшчы кансерватар Анджэй Дуда пераабраны на другі пяцігадовы тэрмін, паведаміла Бі-бі-сі. У ходзе галасавання ў нядзелю ён абышоў ліберальнага мэра Варшавы Рафала Тшаскоўскага. Польская дзяржаўная выбарчая камісія паведаміла, што Дуда набраў у другім туры 51,2 % галасоў, Рафал Тшаскоўскі — 48,8 % (паводле даных з 99,97 % участкаў). Гэта самы нязначны разрыў паміж прэтэндэнтамі на прэзідэнцкіх выбарах у Польшчы з часу падзення камуністычнага рэжыму ў 1989 годзе. Затое яўка аказалася самай высокай у сучаснай гісторыі краіны — 68,2 %. Цяперашнія выбары разглядаліся як прынцыповая спрэчка пра будучыню Польшчы і яе адносіны з ЕС. Анджэй Дуда стаіць на пазіцыях кансерватыўнай маралі, у прыватнасці, па пытаннях абортаў і аднаполых шлюбаў. Пры гэтым ён таксама выступае за шчодрую сацыяльную дапамогу бедным сем'ям.

## Набажэнствы ў мячэці Айя-Сафія ў Стамбуле пачнуцца 24 ліпеня

Аб гэтым заявіў прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган падчас тэлевізійнай прамовы. «Як і ў выпадку з усімі астатнімі мячэцямі, дзверы Айя-Сафіі будуць адчынены для ўсіх, у тым ліку грамадзян Турцыі і турыстаў», — удакладніў ён. Таксама прэзідэнт заклікаў паважаць рашэнне турэцкага суда па вяртанні Айя-Сафіі статусу мячэці, прычым пярэчанні супраць судовай пастановы будуць расцэньвацца як «парушэнне нашага суверэнітэту». Сабор быў дабудаваны і асвячоны ў 537 годзе і доўгі час з'яўляўся найбуйнейшай у свеце хрысціянскай святыняй. Пасля таго як Канстанцінопаль у 1453-м узялі войскі турэцкага султана, ён стаў мячэццю. Каб праводзіць у ім набажэнствы, лікі святых на насценных роспісах прыкрылі, а прыкладна ў XVIII стагоддзі і зусім пазамазвалі. Музеем Святую Сафію зрабіў заснавальнік сучаснай Турцыі Кемаль Атацюрк, які паслядоўна выбудоўваў свецкую дзяржаву, імкнучыся аддзяляць іслам ад палітыкі. Па яго асабістым указанні сабор атрымаў музейны статус. Калі Святая Сафія стала музеем, у ёй выявілі бясцэнныя помнікі культуры — візантыйскія фрэскі і роспісы.



## У Кітаі ацанілі эканамічны ўрон ад паводак у больш чым $11 млрд



Узровень вады ў 433 рэках Кітая з-за моцных ападкаў перавысіў небяспечную адзнаку, у 33 з іх пабіты гістарычны рэкорд, паведаміла міністэрства водных рэсурсаў КНР. Залевы ў шэрагу раёнаў Кітая вымусілі ўлады аб'явіць перадапошні — другі — узровень небяспекі. Цяпер узровень вады ў нізоўях галоўнага патоку ракі Янцзы і ў азёрах Дунціху, Паянху (найбуйнейшае прэснаводнае возера ў Кітаі), Тайху па-ранейшаму перавышае крытычны ўзровень. Паводкі, выкліканыя праліўнымі дажджамі, закранулі амаль 38 мільёнаў чалавек у 27 рэгіёнах краіны. Больш за 140 чалавек загінула або прапала без вестак. 2,25 мільёна жыхароў былі эвакуіраваныя, звыш 1,26 мільёна маюць патрэбу ў экстранай дапамозе. Затоплена больш чым 3,5 мільёна гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў, разбурана або часткова пацярпела больш за 28 тысяч дамоў і пабудоў. Улады ацэньваюць прамы эканамічны ўрон ад стыхіі ў 82,2 млрд юаняў ($11,75 млрд). Старшыня КНР Сі Цзіньпін даручыў прыняць усе меры для выратавання людзей і забеспячэння бяспекі іх уласнасці.

Жніво-2020

# Якасна і без затрымак

**На Гомельшчыне распачата ўборка азімых збожжавых культур. У трох раёнах вобласці — Калінкавіцкім, Петрыкаўскім і Рэчыцкім — прыступілі да работ на палетках.**



Фота БелТА.

— У Калінкавіцкім і Петрыкаўскім раёнах пачалі з уборкі азімага ячменю, — адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення інтэнсіфікацыі раслінаводства камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Алена ФІЛІПОВІЧ.** — У гаспадарках Рэчыцкага раёна ўзяліся за ўборку азімага жыта, ячменю і пшаніцы.

У цэлым у Гомельскай вобласці агульны збожжавы клін складае 344 тысячы гектараў без уліку кукурузы, проса і грэчкі. Галоўная задача, якая стаіць перад аграрыямі, — правесці ўборачную якасна і без затрымак.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Працаўладкаванне

# Паўтысячы новых вакансій на дзевяці прадпрыемствах Мінска

**Электронны кірмаш вакансій будзе праведзены ў чацвер 16 ліпеня камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама пры падтрымцы Мінпрацы і сацабароны.**

У дзяржаўнай службе занятасці паведамілі, што электронны кірмаш вакансій будзе даступны на сайце http://e-vacancy.by. Згаданая паслуга прапануецца ўсім жыхарам Беларусі (незалежна ад прапіскі) і значна скарачае перыяд пошуку работы.

У мерапрыемстве будуць удзельнічаць дзевяць арганізацый Мінска. Гэта акцыянерныя таварыствы «Керамін» і «Крыніца», ААТ «МАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БелаўтаМАЗ», прадпрыемствы «Мінскрамбуд» і «Мінскі мясакамбінат», ДП «Мінсктранс» (чатыры філіялы), РУП «Белмедпрэпараты», унітарныя прадпрыемствы «Мінсккамунцеплассетка» і «Мінскводаканал».

Ужо цяпер вядома, што гэтымі арганізацыямі будзе прапанавана больш за 500 вакансій. Саіскальнікі змогуць задаць наймальнікам пытанні, якія іх цікавяць, і атрымаць кансультацыі з 10.00 да 12.00. Але арганізатары кірмашу адзначаюць, што нават па заканчэнні мерапрыемства доступ да вакансій захаваецца, бо ўсе актуальныя прапановы па працаўладкаванні будуць аўтаматычна перанесены ў базу даных на партале службы занятасці http://gsz.gov.by.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# Дажджліва і холадна

## Тэмпературны рэжым у нашым рэгіёне на гэтым тыдні будзе на 2—5 градусаў ніжэй за кліматычную норму

**У мінулую нядзелю даволі свежае паветра распаўсюдзілася на ўсю краіну, і тэмпература аказалася на 3—5 градусаў ніжэй патрэбнага графіка па кліматычнай норме ў ліпені. Гаспадаром умоў надвор'я яно застанецца амаль на ўвесь тыдзень. Асабліва свежа будзе ў ранішнія гадзіны, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўздзень па ўсходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны месцамі прагрымяць навальніцы. Вецер будзе паўночны, паўночна-заходні ўмераны, удзень па ўсходзе парывісты. Тэмпература паветра ў разгар дня будзе ад плюс 17 да плюс 23 градусаў.

І ў сераду ў асноўным будзе без дажджоў і з халоднай тэмпературай. Чакаецца пераменная воблачнасць. Уначы і раніцай па захадзе Беларусі чакаецца слабы туман. Вецер будзе паўночна-заходні ўмераны, па ўсходзе парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да плюс 13 градусаў. Удзень сонца стане награваць паветра, але цяпла будзе недастаткова. Чакаецца 16—23 градусы са знакам плюс, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да плюс 25 градусаў.

Большая частка тэрыторыі краіны апынецца ва ўладзе антыцыклону ў чацвер. Таму будзе без ападкаў, толькі ўдзень па паўднёвым захадзе краіны, пад уплывам франтальнага раздзелу, які змяшчаецца з тэрыторыі Польшчы, магчымы кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да плюс 13 градусаў. Удзень стане крыху цяплей — будзе ад плюс 20 да 27 цяпла.

У пятніцу і ў выхадныя паўночна-заходні ўмераны вецер працягне пастаўляць досыць халоднае паветра са Скандынаўскага паўвострава. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—15 цяпла, удзень будзе ад плюс 18 градусаў да 25. Сярэдняя сутачная тэмпература паветра крыху павысіцца, але недастаткова для ліпеня. Бо такі тэмпературны фон на 2-3 градусы ніжэй за кліматычную норму.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Прававая адукацыя

# Як і калі прыняць спадчыну, атрымаць яе і захаваць

**Пасля смерці роднага чалавека пытаннямі спадчыны пачынаеш займацца толькі праз нейкі час, калі крыху акрыяеш пасля страты. А часта на фармальнасці ўвогуле забываешся, бо лічыш, што ўсё аўтаматычна пераходзіць табе ад бацькоў. Аднак гэта не так, і прымаць спадчыну трэба, прычым у шасцімесячны тэрмін з дня смерці спадчынадаўца. Пры гэтым можна толькі прыняць спадчыну, а можна яшчэ афарміць яе на сябе (уступіць у спадчынныя правы). У чым розніца і як гэта робіцца, карэспандэнту «Звязды» дапамагалі разбірацца спецыялісты.**



## Без прывязкі да тэрыторыі, але ў межах горада

Згодна з законам, у Беларусі, каб атрымаць спадчыну, нашчадкі, дзе б яны ні знаходзіліся, павінны прыехаць да таго натарыуса, які абслугоўвае тэрыторыю, дзе жыў памерлы, растлумачыла **Наталля БАРЫСЕНКА, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты.**

— Аднак у некаторых гарадах практыкуецца новая форма работы — «спадчына без меж», якая дае магчымасць звярнуцца да любога натарыуса акругі незалежна ад апошняга месца рэгістрацыі спадчынадаўца. Паслуга, такім чынам, аказваецца максімальна блізка і зручна для асобы, якая зацікаўлена ў атрыманні спадчыны, — спадчынніка, — дадала суразмоўніца.

З 1 студзеня 2018 года з мэтай удасканаліць натарыяльныя паслугі гэты эксперымент быў распачаты ў Брэсце і Баранавічах. У сакавіку 2018-га да яго далучыліся горад Гродна і наваколле. Сёлета «спадчына без меж» практыкуецца таксама ў Лідзе і Мазыры.

— Чалавеку цяпер не трэба ехаць у пэўную натарыяльную кантору акругі, што працуе са справамі, якія датычацца вызначанай тэрыторыі. Ён можа звярнуцца ў найбліжэйшае ад яго натарыяльнае бюро ў мясцовасці, дзе жыў памерлы. Напрыклад, наследнік жыве ў Мінску, а спадчынадавец жыў у Брэсце. Спадкаемец можа прыехаць у Брэст і афарміць дакументы ў любой натарыяльнай канторы горада, а не шукаць тую, што абслугоўвае акругу, дзе быў зарэгістраваны памерлы, — расказала **Таццяна ДЗЯЛЕНДЗІК, намеснік старшыні Беларускай натарыяльнай палаты.** — Пры выбары гарадоў для эксперыменту ўлічвалі іх памеры, наяўнасць горадаўтваральных прадпрыемстваў, адлегласць паміж натарыяльнымі канторамі — яны павінны былі знаходзіцца не надта далёка адна ад адной. Новая форма работы прыйшлася даспадобы грамадзянам. За гэтыя два гады большасць скарысталася такой магчымасцю, а не шукала пэўнае натарыяльнае бюро. У далейшым мы пашырым такую форму работы і на іншыя рэгіёны, у тым ліку і ў сталіцы.

У Мінску, дарэчы, ужо разглядаецца магчымасць арганізаваць «спадчыну без меж» у адным з раёнаў горада. Пры гэтым вельмі важна прапрацаваць моманты ўзаемадзеяння паміж натарыусамі, каб выключыць магчымасць адкрыцця дзвюх спадчынных спраў.

«Спадчына без меж» не можа пачаць працаваць абсалютна па ўсёй тэрыторыі краіны, бо ў рэгіёнах існуе не толькі свая спецыфіка, але і добра ўсталяваная практыка работы, мяняць якую не варта. Да таго ж у краіне шмат раённых натарыяльных кантор, якія абслугоўваюць не толькі невялікае мястэчка, дзе знаходзяцца, але і ўвесь раён, і там проста няма «натарыяльнай альтэрнатывы», так што ўводзіць новую форму работы бессэнсоўна, абгрунтавала Таццяна Дзялендзік.

— Напрыклад, у Нясвіжскім раёне толькі адна натарыяльная кантора, якая абслугоўвае і раён, і цэнтр. У Пінску іх дзве: гарадская і раённая, і кожная адказвае за сваю тэрыторыю. Пашыраць «спадчыну без меж» мае сэнс толькі ў абласных цэнтрах краіны і буйных райцэнтрах, дзе ёсць некалькі натарыяльных кантор у межах аднаго горада, — удакладніла яна.

## Прысутнасць і дыстанцыйнасць

Натарыус у сваёй рабоце заўжды павінен пацвердзіць асобу грамадзяніна і яго добраахвотнае жаданне здзейсніць пэўную працэдуру. Таму аформіць дакументы праз інтэрнэт немагчыма, трэба фізічная прысутнасць.

— Наступствы кожнага дзеяння, з якім звяртаецца чалавек, — вельмі сур'ёзныя. Працэдуры датычацца даверанасцяў на маёмасць, яе адчужэнне і распараджэнне ёю, карыстанне аўтамабілямі і іншыя рэчы, — заўважыла Таццяна Дзялендзік. — Аднак цяпер прапрацоўваецца магчымасць дазволіць здзяйсняць шэраг натарыяльных дзеянняў, якія не патрабуюць устанаўлення волевыяўлення чалавека, дыстанцыйна. Напрыклад, заверыць копію дакумента ў электронным выглядзе або засведчыць подпіс перакладчыка. Некаторыя паперы натарыусы атрымліваюць праз інтэрнэт і цяпер — у тым ліку дакументы, якія пацвярджаюць дзяржаўную рэгістрацыю нерухомасці. Аднак тое, што выходзіць непасрэдна «з-пад пяра» натарыуса, пакуль працуе толькі ў папяровым варыянце.

Дарэчы, каб атрымаць ужо гатовыя дакументы, асабістая прысутнасць неабавязковая. Іх можна не толькі забраць самому, але і даручыць камусьці зрабіць гэта, аформіўшы даверанасць, або, каб не траціць грошы на гэтую працэдуру, папярэдзіць натарыуса загадзя, каб дакументы даслалі вам поштай.

## Прыняць — паўгода, афармляць — колькі заўгодна

Каб прыняць спадчыну, наследнік павінен асабіста звярнуцца да натарыуса, які працуе ў межах акругі, дзе жыў памерлы, не пазней чым праз шэсць месяцаў з моманту смерці чалавека.

— Спадкаемец можа таксама даслаць натарыусу па пошце ліст і ў ім заявіць, што прымае спадчыну, — гэтага будзе дастаткова, каб лічыцца тым, хто прыняў спадчыну (спадчыннікам). Гэта абавязкова зрабіць у шасцімесячны тэрмін. А вось ужо афармляць спадчыну трэба асабіста, і тэрмін для гэтага неабмежаваны, — удакладніла намеснік старшыні натарыяльнай палаты. — Да натарыуса можна звяртацца толькі з пашпартам. Усе астатнія дакументы, неабходныя для афармлення, запросіць спецыяліст. Можна сабраць пакет дакументаў і самому — гэта пашпарт, пасведчанне аб смерці, паперы, якія пацвярджаюць сваяцтва, дакументы на маёмасць. Калі пэўнай паперы не хапае, яе таксама здабудзе натарыус.

Дакумент, які дае права на спадчыну, — пасведчанне аб праве на спадчыну — выдаецца цягам паўгода з моманту смерці. Калі гэта права на нерухомасць, то дакумент неабходна зарэгістраваць у органах рэгістрацыі нерухомасці.

Кошт паслугі афармлення пасведчання аб праве на спадчыну прапарцыянальны памеру базавай велічыні (БВ) на дзень ажыццяўлення натарыяльнай працэдуры. Пры блізкім сваяцтве (муж, жонка, дзеці, бацькі) дакумент каштуе адну БВ — цяпер гэта 27 рублёў.

Афармленне спадчыны будзе каштаваць ужо значна больш. Аднак гэтага можна, дарэчы, у далейшым і не рабіць — уласнасць усё роўна ўжо будзе належаць чалавеку, які аформіў на яе правы, і ён будзе абавязаны даглядаць маёмасць і плаціць па рахунках. Пры разводзе маёмасць застаецца ўласнасцю толькі аднаго з сужэнцаў і не будзе дзяліцца паміж абедзвюма паловамі, яе таксама нельга ўключыць у шлюбны дагавор, нават калі муж і жонка на гэта згодны. А ў выпадку смерці чалавека, які прыняў, але не аформіў спадчыну, на яе будуць мець правы яго нашчадкі.

— У спадчынніка, які прапусціў тэрмін для прыняцця спадчыны, але хоча гэтае становішча выправіць, існуе некалькі варыянтаў. Калі дакумент ужо своечасова аформілі іншыя спадкаемцы, патрэбна іх згода, каб уключыць у правы на спадчыну сваяка, які спазніўся, — падкрэсліла Таццяна Дзялендзік. — Калі ж сваякі супраць ці чалавек проста не хоча звяртацца да іх па дазвол, можна адправіцца ў суд, каб быць прызнаным наследнікам, які прыняў спадчыну. У большасці выпадкаў суды становяча разглядаюць такія справы.

Аднак лепш вырашаць падобныя спрэчкі палюбоўна, у тым ліку і з дапамогай медыятара, бо як пасля суда карыстацца доляй у спадчынным доме, а тым больш жыць у ім разам?..

**Ірына СІДАРОК.**



# ЭКАНОМІКА І НАСТУПСТВЫ ПАНДЭМІІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Падтрымка аказваецца па заяўным прынцыпе ці якім іншым? Хто ўжо звярнуўся па дапамогу?***

— Аказанне падтрымкі ажыццяўляецца як па заяўным прынцыпе, так і па падачы ўдакладняльных дэкларацый у Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па месцы знаходжання суб'екта гаспадарання. Па стане на 7 ліпеня ў Мінскай вобласці задаволена амаль восем тысяч зваротаў, 99 % з іх датычыцца падаткаабкладання.

***— Ці рэкамендавана зніжаць стаўкі арэнднай платы на сваіх аб'ектах прыватным арэндадаўцам?***

— Мінскім аблвыканкамам і рай-, гарвыканкамамі праведзена работа па інфармаванні юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў аб магчымасці даваць арандатарам — суб'ектам гаспадарання з улікам аб'ёму іх выручкі адтэрміноўку па аплаце арэнднай платы, а таксама змяншаць яе памер. І многія з іх прымаюць рашэнні па змяншэнні ставак арэнднай платы.

***— Якія пытанні часцей за ўсё ўзнікаюць у суб'ектаў гаспадарання па нормах указа?***

— У цяперашні час у суб'ектаў гаспадарання пытанні па рэалізацыі нормаў указа амаль адсутнічаюць. Гэтаму паспрыяла тое, што Мінаблвыканкам сумесна з мясцовымі і распарадчымі органамі ўлады, іншымі зацікаўленымі бакамі распрацаваў метадычныя рэкамендацыі ў частцы падаткаабкладання і арэндных адносін. Яны размешчаны на афіцыйных сайтах Мінаблвыканкама, райгарвыканкамаў і ў рэгіянальных сродках масавай інфармацыі. Акрамя таго, на месцах вызначаны спецыялісты, адказныя за работу па гэтым нарматыўным прававым акце.

**«Па стане на 7 ліпеня ў Мінскай вобласці задаволена амаль восем тысяч зваротаў, 99 % з іх датычыцца падаткаабкладання».**

***— Як памяншэнне памеру падатковых плацяжоў і іх адтэрміноўка паўплываюць на напаўненне мясцовых бюджэтаў?***

— Адтэрміноўкі плацяжоў — гэта не страты бюджэту, а паступленні, якія прыйдуць у казну пазней, калі прадпрыемствы, якія пацярпелі ад наступстваў пандэміі, пачнуць працаваць на поўную моц.

Што датычыцца недаатрыманых даходаў у сувязі са змяншэннем памеру падатковых плацяжоў, то неабходна сачыць, каб не было разбалансаванасці бюджэту. У першую чаргу — за кошт змяншэння не першачарговых расходаў. З другога боку, дзяржава ў асобе мясцовых органаў улады ідзе насустрач сумленным суб'ектам гаспадарання, якія, нягледзячы на часовыя цяжкасці, працягваюць захоўваць працоўныя калектывы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Дэмаграфія

# АДНА СПРОБА ЭКА — БЯСПЛАТНА

## Больш бяздзетных сем'яў атрымаюць шанц стаць бацькамі

**Прымяненне метадаў дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій дазваляе шлюбным парам стаць бацькамі. Летась з дапамогай ЭКА наступіла цяжарнасць у 1805 жанчын, што складае 1,24 працэнта ад агульнай колькасці родаў у краіне. Пра гэта расказала галоўны спецыяліст аддзела дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Людміла КЕДА.**

### Шчасце мець дзіця

— Са студзеня 2021 года ў сілу ўступіць Указ Прэзідэнта № 171 «Аб сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян», які дазволіць шматлікім сямейным парам мець права на адну бясплатную спробу экстракарпаральнага апладнення. Скарыстацца гэтым змогуць тыя пары, якія з'яўляюцца грамадзянамі Беларусі, пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці супрацьпаказанняў. Акрамя таго, узрост мужа і жонкі не павінен перавышаць 40 гадоў. На сённяшні дзень вызначаны тры арганізацыі, у якіх будуць ажыццяўляцца бясплатныя ЭКА: гэта Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця», сталічны Гарадскі клінічны радзільны дом № 2, а таксама Гомельскі абласны дыягнастычны медыка-генетычны цэнтр з кансультацыяй «Шлюб і сям'я».

Фінансаванне расходаў на адну спробу ЭКА прадугледжваецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Пры гэтым такім правам змогуць скарыстацца таксама пары, якія спрабавалі здзейсніць ЭКА на платнай аснове. Адзінае выключэнне складаюць пары, у якіх ЭКА праводзіцца з выкарыстаннем донарскіх палавых клетак.

У краіне прыблізна 14 працэнтаў пар бясплодныя. Людміла Кеда адзначае, што часцей за ўсё гэта звязана з гінекалагічным анамнезам жанчын, а таксама станам рэпрадуктыўнага здароўя як жанчын, так і мужчын.

— У 2005 годзе колькасць жанчын, якія пакутуюць на бясплоддзе, знаходзілася на ўзроўні 372,1 на 100 тысяч жаночага насельніцтва ва ўзросце ад 18 да 49 гадоў, у мінулым жа годзе гэты паказчык склаў 752,4. Назіраецца стабільна высокая дынаміка тых, каму ўпершыню ставяць дыягназ «бясплоддзе». «Летась гэты паказчык склаў 202,5 на 100 тысяч жаночага насельніцтва. Усяго ў 2019 годзе зарэгістравана 15 496 выпадкаў жаночага бясплоддзя, з іх выяўленых упершыню — больш за 4 тысячы. Расце распаўсюджанасць і мужчынскага бясплоддзя: летась зарэгістраваны 3181 выпадак, што складае 92,2 на 100 тысяч мужчынскага насельніцтва ва ўзросце ад 18 гадоў і старэй.

### Шлюбы і першыя роды «старэюць»

На пачатку года жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту (ад 15 да 49 гадоў) у нашай краіне налічвалася 23 працэнты ад агульнай колькасці насельніцтва. Летась у параўнанні з 2015 годам колькасць такіх жанчын паменшылася на 119 635 чалавек, або на 5,2 працэнта. Адпаведна назіраецца і зніжэнне нараджальнасці. Пра гэта расказала **начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА.**

— Такая сітуацыя сёння назіраецца ў большасці еўрапейскіх краін. Гэта абумоўлена рознымі прычынамі. Адна з іх — павелічэнне ўзросту ўступлення ў шлюб. Калі ў 2009 годзе ў Беларусі для жанчын гэты паказчык быў 24,2 года, для мужчын — 26,4 года, то летась сярэдні ўзрост тых, хто ўступіў у першы шлюб, павялічыўся прыблізна на два гады і склаў для жанчын 26,1 года, для мужчын — 28,3 года. Адпаведна павышаецца ўзрост мацярынства. Сярэдні ўзрост мам пры нараджэнні дзіцяці летась склаў 29,6 года. Пры нараджэнні першынца ён ніжэйшы — 26,8 года, але гэта на 2,5 года больш, чым дзесяць гадоў таму. Дарэчы, у сярэднім узрост мацярынства штогод павялічваецца на тры месяцы. Таксама да прычын можна аднесці зніжэнне колькасці заключаных шлюбаў і высокі ўзровень разводаў, ураўноўванне мужчынскага і жаночага ўнёску ў агульны даход сям'і.



plusmama.ru

Апошнія гады адзначаецца стабілізацыя колькасці родаў, якія праходзяць без ускладненняў. «Скрынінгавае ультрагукавое абследаванне праходзяць 97 працэнтаў будучых мам, што кожны год дазваляе выяўляць каля 1400 выпадкаў прыроджаных парокаў развіцця. Летась удзельная вага нармальных родаў склала 43,1 працэнта, частата кесарава сячэння — 31,3 працэнта, заўчасных родаў — 4,1 працэнта. Шматплодныя роды ў агульнай структуры складаюць 1,2 працэнта. Усяго за мінулы год у краіне нарадзіліся 87 602 дзіцяці, з іх больш за тысячу двайнят і 15 трайнят. На канец першага квартала бягучага года на ўліку ў жаночых кансультацыях стаяла 51 582 цяжарныя жанчыны», — звярнула ўвагу спецыяліст.

— У нашай краіне нізкі паказчык дзіцячай смяротнасці. Летась ён склаў 2,4 на 1000 чалавек, у тым ліку тры смерці на 1000 дзяцей да пяці гадоў. Мацярынская смяротнасць ад акушэрскіх прычын таксама адна з самых нізкіх у свеце, яе паказчык быў роўны 1,1 на 100 000 чалавек. У краіне больш за 20 гадоў паспяхова функцыяніруе рознаўзроўневая сістэма аховы здароўя маці і дзіцяці, што дазваляе кантраляваць розныя паказчыкі. У нас дзейнічаюць Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця» чацвёртага тэхналагічнага ўзроўню, 17 перынатальных цэнтраў трэцяга ўзроўню, 27 перынатальных цэнтраў другога ўзроўню. 64 арганізацыі аховы здароўя належаць да першага, раённага, узроўню.

### «Дывідэнды» ад сямейнага капіталу

У краіне павялічваецца колькасць шматдзетных сем'яў. Гэта сведчыць пра тое, што палітыка дзяржавы, накіраваная на іх падтрымку, дае станоўчы вынік, лічыць Марына Арцёменка. «Больш за 353 тысячы дзяцей у Беларусі выхоўваецца ў шматдзетных сем'ях, гэта фактычна 19 працэнтаў ад агульнай колькасці дзяцей. Пры гэтым павышаецца доля другіх і наступных дзяцей. Калі па выніках перапісу 2009 года ў нас было 62,5 тысячы шматдзетных сем'яў, то сёння іх ужо больш за 108 тысяч. Гэта вельмі пазітыўны трэнд. Дарэчы, самая шматдзетная вобласць — Брэсцкая», — адзначыла яна.

На сённяшні дзень сямейны капітал прызначаны ў краіне больш чым 85,5 тысячы шматдзетных сем'яў. Прынята больш за 16 тысяч рашэнняў аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу. З іх 94 працэнты — на паляпшэнне жыллёвых умоў.

— Вынікі пяцігадовай праграмы сямейнага капіталу паказалі яе эфектыўнасць, — адзначыла Марына Арцёменка. — За пяць гадоў колькасць дзяцей, якія нарадзіліся трэцімі і наступнымі, павялічылася на 40 працэнтаў. Цяпер праграма прадоўжана да 2024 года ўключна. Пашырыліся кірункі яе датэрміновага выкарыстання. Адзін з іх — паляпшэнне жыллёвых умоў для тых, хто знаходзіцца на ўліку маючых патрэбу. Прычым варыянты розныя: набыццё жылля, пагашэнне запазычанасці па выдадзеных крэдытах. Другі кірунак — атрыманне любым членам сям'і платных медыцынскіх паслуг. Гэта прадугледжвалася і раней, але цяпер пашырана за кошт стаматалагічных паслуг. Трэці — атрыманне вышэйшай адукацыі першай ступені (таксама любым членам сям'і).

Дарэчы, наша краіна знаходзіцца ў лідарах сярод іншых па працягласці водпуску па доглядзе дзіцяці — у нас ён прадугледжаны да трох гадоў. Выплата пры нараджэнні першынца складае 35 працэнтаў заработнай платы, пры нараджэнні другога дзіцяці і наступных — 40 працэнтаў. Значнымі з'яўляюцца і памеры аднаразовых дапамог — 10 бюджэтаў пражытачнага мінімуму пры нараджэнні першага дзіцяці і 14 бюджэтаў пры нараджэнні другога і наступных дзяцей.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

❍ Дарэчы

**На сёння ў краіне зарэгістравана каля 500 цяжарных і парадзіх з каранавіруснай інфекцыяй. Аднак выпадкаў, якія прывялі б да крытычных сітуацый, або цяжкіх пацыентак пакуль не было, адзначаюць спецыялісты. «У краіне прыняты ўсе меры, каб мінімізаваць рызыку інфіцыравання COVID-19 цяжарных і нованароджаных. З самага пачатку развіцця сітуацыі ў нас былі вызначаны радзільныя дамы і аддзяленні, у якіх праводзіліся роды такіх пацыентак. У Мінску, напрыклад, — шостае радзільнае аддзяленне гарадской клінічнай бальніцы № 6. Быў размежаваны паток наведвання жаночых кансультацый. На сёння забаронены наведванні ў радзільных дамах, таксама ўведзена абмежаванне на партнёрскія роды».**

Фінансавая палітыка

# Доступ да валютных таргоў

**Фізічныя асобы цяпер маюць магчымасць ажыццяўляць валютна-абменныя аперацыі на бясплатнай гандлёвай анлайн-пляцоўцы «Дабрабыт.Трэйдар». Цяпер можна прадаваць і купляць валюту па каціроўках, якія больш выгадныя, чым курсы ў абменных пунктах і офісах банкаў.**

На гэтай пляцоўцы бягучы курс валют змяняецца ў рэжыме рэальнага часу. Як гэта працуе? Банк атрымлівае доступ да каціровак міжнароднага тэрмінала Thomson Reuters і на іх аснове ўстанаўлівае ўласны курс. Для яго характэрная мінімальная розніца паміж цаной пакупкі і продажу. Усе аперацыі на электроннай пляцоўцы ажыццяўляюцца імгненна ў рэжыме анлайн. Падключыцца да яе можна ў любы час сутак з камп'ютара або наўтбука. Карыстацца сэрвісам можна бясплатна, няма і камісій за рэгістрацыю і абслугоўванне.

З даступных замежных валют — долары, еўра, расійскія рублі. У сістэме няма абмежаванняў ні па максімальнай суме, ні па колькасці здзелак. У банку запэўніваюць, што гатовыя да аперацый любога аб'ёму. Пры гэтым пляцоўка мае нізкі парог — гандляваць можна сумай ад 1 долара ці еўра.

Пляцоўка дазваляе ажыццяўляць аперацыі не толькі па бягучых каціроўках. Таксама магчыма адправіць заяўку на індывідуальны курс — з банкам можна дамовіцца аб больш выгадных умовах. «Раней, каб дамовіцца аб персанальных умовах здзелкі, неабходна было валодаць сумай звыш 1000 базавых велічынь (каля 12,5 тысячы долараў), пазваніць у банк і прыехаць у офіс. Цяпер жа дзякуючы новай пляцоўцы можна імгненна мяняць любыя сумы па выгадных курсах. Прычым можна самастойна вызначаць найбольш зручны для гэтага момант, ажыццявіць здзелку ў любым зручным месцы і не хвалявацца, што курс зменіцца, пакуль вы будзеце ехаць у банк», — падкрэсліў **намеснік старшыні праўлення ААТ «Банк Дабрабыт» Аляксандр ПЛІТКО.**

Пляцоўка даступная пры наяўнасці любога адкрытага фінансавага прадукту ў банку. Ажыццяўленне здзелак адбываецца па бягучых рахунках. Адкрыць іх можна ў мабільным або інтэрнэт-банку, а таксама на самой пляцоўцы. Кліенты іншых банкаў могуць прыступіць да таргоў пасля аўтарызацыі ў міжбанкаўскай сістэме ідэнтыфікацыі (МСІ).

Каб зрабіць сэрвіс яшчэ зручнейшым, у перспектыве плануецца запусціць мабільную праграму, актывізаваць магчымасць правядзення валютна-абменных аперацый з рахункаў, да якіх выпушчаны банкаўскія плацежныя карткі, рэалізаваць навінны сэрвіс унутры платформы і падключыць дадатковыя знешнія гандлёвыя пляцоўкі. Апошняе дазволіць паменшыць розніцу паміж цэнамі пакупкі і продажу валют.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

